# Раздзел IV. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У КАНЦЫ XX — ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст.

## *§ 52–0. Свет у канцы XX — першай чвэрці XXI ст.

ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ «ХАЛОДНАЯ ВАЙНА»
ІНФАРМАЦЫЙНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ПОСТІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА
АДНАПАЛЯРНЫ СВЕТ
ШМАТПАЛЯРНЫ СВЕТ
БІПАЛЯРНЫ СВЕТ

**1. Геапалітычныя наступствы распаду СССР.** Распад СССР у 1991 г. быў адной з ключавых падзей сучаснай гісторыі, якая вызначыла міжнародныя адносіны ў канцы XX — пачатку XXI ст. Ён азнаменаваў канец «халоднай вайны», разбурэнне ранейшага міжнароднага парадку і пачатак новага перыяду ў гісторыі — з новымі дзяржавамі, канфліктамі, саюзамі і выклікамі.

**Пошук новых шляхоў супрацоўніцтва**

У пошуках новых формаў узаемадзеяння дзяржавы, што ўтварыліся пасля распаду СССР, у 1991 г. заснавалі арганізацыю пад назвай Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД). Яна заклікана паспрыяць развіццю сувязей паміж рэспублікамі, умацаванню гандлёвых адносін і вырашэнню сумесных пытанняў, што асабліва важна ва ўмовах глабальных змен.

| Геапалітычныя наступствы распаду СССР |
| --- |
| З палітычнай карты свету знікла адна з дзвюх звышдзяржаў. Скончылася «халодная вайна». Пачало замацоўвацца аднапалярнае ўладкаванне свету з дамінуючай роляй ЗША |
| 15 незалежных дзяржаў, што раней уваходзілі ў склад СССР, сталі суб'ектамі міжнародных адносін |
| Расія як правапераемніца СССР атрымала ў спадчыну значную частку эканамічнага, ваеннага і палітычнага патэнцыялу, аднак страта тэрыторый і саюзнікаў істотна аслабіла яе пазіцыі і ўплыў у свеце |
| Адбылося пашырэнне НАТА на ўсход. У альянс увайшлі краіны, якія раней уваходзілі ў сацыялістычны блок, і некаторыя былыя рэспублікі СССР |
| Збліжэнне шэрагу краін былога СССР і яго саюзнікаў (краіны Прыбалтыкі, Усходняй Еўропы) з Захадам, імкненне да інтэграцыі з Еўрапейскім саюзам |
| Абвастрэнне нацыянальных канфліктаў на постсавецкай прасторы: Прыднястроўе (Малдова), Карабах (Азербайджан і Арменія), Абхазія і Паўднёвая Асеція (Грузія), Таджыкістан. Абвастрэнне пытанняў, звязаных са становішчам этнічных меншасцей у былых рэспубліках СССР (грамадзянства, правы, мова) |
| Змены ў сферы ядзернай бяспекі. Пасля распаду СССР ядзерная зброя апынулася на тэрыторыі чатырох дзяржаў — Расіі, Украіны, Беларусі і Казахстана. У 1990-я гг. яе перадалі Расіі. Украіна, Беларусь і Казахстан адмовіліся ад статусу ядзернай дзяржавы |

Як вы лічыце, чаму распад СССР называюць найбуйнейшай геапалітычнай катастрофай другой паловы XX ст., наступствы якой нагадваюць аб сабе да нашага часу? Сваю думку растлумачце.

У наш час СНД адыгрывае ролю пляцоўкі для дыялогу і супрацоўніцтва, дазваляе краінам знаходзіць шляхі для ўзаемавыгаднага партнёрства.

**2. Глабалізацыя.** *Глабалізацыя* — адзін з найважнейшых працэсаў канца XX — пачатку XXI ст. Па сутнасці, яна з'яўляецца працягам тых працэсаў, якія зарадзіліся яшчэ ў эпоху Вялікіх геаграфічных

адкрыццяў і прамысловай рэвалюцыі, але набылі шырокі размах толькі ў Навейшы час.

### Вытокі глабалізацыі

Тэрмін «глабалізацыя» шырока выкарыстоўваюць з канца 1980-х гг. Масавае выкарыстанне гэтага паняцця звязваюць з рэзкім паскарэннем тэхналагічнага прагрэсу, ростам уплыву транснацыянальных карпарацый і ўзмацненнем міжнародных сувязей. Пасля заканчэння «халоднай вайны» гэты працэс стаў больш інтэнсіўны.

Чаму пасля заканчэння «халоднай вайны» працэсы глабалізацыі паскорыліся?

### Супярэчлівы характар глабалізацыі

Глабалізацыя ўтрымлівае ў сабе вострыя супярэчнасці. З аднаго боку, яна спрыяе развіццю міжнароднага падзелу працы і спецыялізацыі краін на вытвор-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




Глабалізацыя — гэта заканамерны вынік развіцця грамадства. Развіццё транспарту, тэлекамунікацый, інтэрнэту і лічбавых тэхналогій ператварыла свет у «глабальную вёску», дзе інфармацыя і тавары перадаюцца імгненна, а падзеі ў адной краіне здольныя паўплываць на ўвесь свет.

1. *Назавіце станоўчыя і негатыўныя наступствы згаданых з'яў глабалізацыі.*
2. *Якія яшчэ з'явы сучаснага грамадства, на вашу думку, з'яўляюцца сімваламі глабалізацыі?*

часці пэўных тавараў і паслуг, што павышае эфектыўнасць і прадукцыйнасць; прыводзіць да зніжэння выдаткаў і цэн на тавары і паслугі; спрыяе развіццю новых тэхналогій і паляпшэнню якасці тавараў і паслуг; аблягчае пашырэнне інфармацыі і адукацыйных рэсурсаў, павышае агульны ўзровень адукацыі і ведаў; спрыяе ўзаемадзеянню паміж рознымі культурамі і народамі; людзі атрымліваюць доступ да большай колькасці культурных каштоўнасцей, магчымасці для падарожжаў і прафесійнага росту; стварае аснову для аб'яднання намаганняў сусветнай супольнасці ў супрацьстаянні агульным выклікам, такім як экалагічныя і сацыяльныя праблемы.

З іншага боку, яна ўзмацняе залежнасць адных краін ад іншых, стварае рызыкі страты культурнай самабытнасці, паглыбляе сацыяльную няроўнасць паміж дзяржавамі і ўнутры іх. Буйны́я транснацыянальныя карпарацыі і міжнародныя арганізацыі атрымалі велізарную ўладу, якая часам пераўзыходзіць уплыў асобных дзяржаў.

### Лічбавізацыя

Адным з ключавых інструментаў глабалізацыі выступіла *лічбавізацыя* — масавае ўкараненне лічбавых тэхналогій ва ўсе сферы жыцця. З аднаго боку, гэта дае новыя магчымасці: анлайн-адукацыя, электронныя паслугі, доступ да інфармацыі. З другога — прыводзіць да росту кантролю над грамадствам. Дзяржаўныя і наддзяржаўныя структуры, карпарацыі атрымліваюць доступ да велізарных аб'ёмаў звестак пра грамадзян. Гэта выклікае асцярогі наконт умяшання ў прыватнае жыццё, маніпуляцый грамадскай думкай і навязвання пэўных узораў і мадэляў паводзін.

> Чаму ва ўмовах глабалізацыі робіцца асабліва актуальнай абарона персанальных дадзеных чалавека? Назавіце спосабы іх абароны.

### Пашырэнне заходняй культуры

Глабалізацыя спрыяе пашырэнню заходніх каштоўнасцей пад выглядам універсальных, аднак заходні погляд на правы чалавека, свабоду асобы і талерантнасць выклікае неадназначную рэакцыю ў свеце. Адны ўспрымаюць такія працэсы як крок да адзінага чалавецтва, іншыя — як культурную экспансію,

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




**З Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2024 г.)**

Сучасны свет знаходзіцца ў стане глабальнай геапалітычнай напружанасці, абумоўленай працэсамі разбурэння ўсталяванага сусветнага парадку…

…Ажыццяўляецца знешняе ўмяшанне ва ўнутраныя справы дзяржаў для прасоўвання сваіх нацыянальных і калектыўных інтарэсаў у парушэнне агульнапрызнаных нормаў і прынцыпаў міжнароднага права. Побач з традыцыйнымі формамі ўзброенага процiборства ўсё часцей выкарыстоўваюцца інструменты «разумнай» сілы. Вядзецца актыўная барацьба за масавую свядомасць для рэалізацыі тэхналогій каляровых рэвалюцый.

Інфармацыйная сфера робіцца арэнай міждзяржаўнага супрацьстаяння. У выніку культурна-ідэалагічнай экспансіі мэтанакіравана скажаецца гістарычная праўда, ажыццяўляецца фальсіфікацыя гісторыі, разбураюцца культурная спадчына чалавецтва, традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці народаў, іх нацыянальная ідэнтычнасць, інстытут сям'і і прастора міжкультурнага ўзаемадзеяння. Электронныя сродкі масавай камунікацыі выкарыстоўваюцца для правакавання ўнутраных канфліктаў і разбурэння дзяржаў…

1. *Калі і кім зацверджана Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады крызісных з'яў у сучасным свеце, якія адлюстраваны ў дадзеным фрагменце Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.*
3. *Як вы лічыце, чаму ў якасці аднаго з асноўных нацыянальных інтарэсаў нашай краіны ў палітычнай сферы ў Канцэпцыі ўказана забеспячэнне электаральнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь? Што такое электаральны суверэнітэт?*

падрыў традыцыйных духоўных і маральных каштоўнасцей.

**Абарона нацыянальных інтарэсаў**

Глабалізацыя вымушае дзяржавы абараняць свае нацыянальныя інтарэсы, культуру і суверэнітэт. Адным са шляхоў абароны з'яўляецца стварэнне рэ-

гіянальных аб’яднанняў (ЕАЭС, ШАС і інш.), а таксама развіццё лічбавага суверэнітэту — імкненне да фарміравання ўласнай інфармацыйнай прасторы.

Глабалізацыя — гістарычна заканамерны працэс. Але тое, якая яна будзе — адкрытая і справядлівая або кіраваная вузкім колам уплывовых дзяржаў, — залежыць ад рашэнняў, якія прымаюцца сёння. У сучасным свеце важна не проста быць уключаным у глабальныя працэсы, але і ўмець адстойваць свае каштоўнасці, інтарэсы і права на самастойны шлях развіцця.

**3. Постіндустрыяльнае грамадства.** *Інфармацыйная рэвалюцыя* паспрыяла паступоваму пераходу чалавецтва ў другой палове XX ст. ад індустрыяльнага да *постіндустрыяльнага грамадства*.

**Вытворчасць інфармацыі**

У індустрыяльным грамадстве галоўнай крыніцай багацця з’яўляюцца машыны і вытворчасць. Большасць людзей працуюць на заводах, фабрыках, у будаўнічай сферы. У постіндустрыяльным грамадстве на першае месца выходзяць веды, найноўшыя тэхналогіі, інфармацыя. Для яго характэрныя памяншэнне ролі прамысловасці ў эканоміцы і ўзрастанне значэння сферы паслуг. Найважнейшым таварам робіцца інфармацыя.

> Успомніце, што такое постіндустрыяльнае грамадства.

**Змены ў прамысловасці**

Пры гэтым змяняецца і вытворчасць традыцыйных тавараў. Замест масавай стандартызаванай прадукцыі ўзрастае вытворчасць адзінкавых якасных тавараў. У сувязі з гэтым усё большую ролю ў прамысловасці адыгрываюць малыя прадпрыемствы, здольныя хутка пераналадзіцца на вытворчасць невялікай партыі новай прадукцыі. Самымі высокімі тэмпамі развіваюцца галіны прамысловасці, якія актыўна выкарыстоўваюць найноўшыя навуковыя распрацоўкі: электратэхнічная, авіякасмічная, хімічная, транспартнае машынабудаванне.

**Змены ў характары працы чалавека**

У постіндустрыяльным грамадстве змяняецца характар працы чалавека. Значна павялічваецца попыт на высокакваліфікаваных спецыялістаў разумовай

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



1. *Разгледзьце ілюстрацыю. Хто на ёй паказаны? Як складваюцца адносіны паміж гэтымі персанажамі?*
2. *Які працэс паказаў аўтар дадзенай ілюстрацыі? Вынікам якіх падзей ён зрабіўся?*
3. *Спрагназуйце, як гэты працэс можа змяніць рынак працы.*

працы («белыя каўнерыкі»). Павышэнне кваліфікацыі работнікаў вядзе да росту іх даходаў і павелічэння колькасці прадстаўнікоў сярэдняга класа ў грамадстве.

**Патрабаванні постіндустрыяльнага грамадства да сучаснага чалавека**

У постіндустрыяльным грамадстве ключавое значэнне набывае адукацыя. Для таго каб паспяхова адаптавацца ў новым грамадстве, неабходна ўвесь час вучыцца. Адрозненне паміж тымі, хто валодае сучаснымі ведамі і тэхналогіямі, і тымі, хто не мае да іх доступу, няспынна расце. Некаторыя прафесіі знікаюць, з'яўляюцца новыя, і людзям даводзіцца мяняць сферу дзейнасці. Усё гэта патрабуе гнуткасці, высокай адукацыйнай падрыхтоўкі і здольнасці да навучання на працягу ўсяго жыцця.

Як вы разумееце лозунг: «Адукацыя не на ўсё жыццё, а праз усё жыццё»?

**Аднапалярны свет**

**4. Ад аднапалярнага свету да шматпалярнага.** Пасля распаду СССР у 1991 г. і заканчэння *«халоднай вайны»* надышоў перыяд, які гісторыкі і палітолагі назвалі *аднапалярным светам* — сістэмай, дзе вядучую ролю адыгрывала адна дзяржава — Злучаныя Штаты Амерыкі.

У 1990–2000-я гг. ЗША пачалі актыўна ўмешвацца ў палітычныя працэсы ў розных рэгіёнах, выступаць ініцыятарам ваенных аперацый, аказваць эканамічны і палітычны ціск, адыгрываючы ключавую ролю ў дзейнасці міжнародных арганізацый, такіх як НАТА, Сусветны банк, Міжнародны валютны фонд. Амерыканская мадэль дэмакратыі, рыначнай эканомікі і культурных стандартаў пашырылася па ўсім свеце праз глабальныя сродкі масавай інфармацыі, тэхналогіі і арганізацыі.

Аднак аднапалярная сістэма аказалася няўстойлівая. Па-першае, яна не забяспечвала роўнага ўліку інтарэсаў усіх дзяржаў. Па-другое, дзеянні ЗША часцяком выклікалі крытыку і супраціўленне, асабліва калі гаворка ішла пра прымяненне сілы без санкцыі ААН. Яскравы прыклад — агрэсія ваеннага блока НАТА ў адносінах да Югаславіі (1999 г.), Афганістана (2001 г.), Ірака (2003 г.). Гэтыя падзеі прывялі да аслаблення міжнароднага права, узмацнення нестабільнасці ў шэрагу рэгіёнаў, рэгіянальных канфліктаў і войнаў.

**Фарміраванне шматпалярнага свету**

У выніку з пачатку XXI ст. пачаў фарміравацца *шматпалярны свет*, пры якім некалькі краін і рэгіянальных аб'яднанняў аказваюць уплыў на глабальную палітыку і эканоміку. Такі парадак лепш улічвае інтарэсы розных цывілізацый, культур і дзяржаў.

**Рэгіянальныя лідары**

Імклівы эканамічны рост Кітая, развіццё Расіі, умацаванне міждзяржаўных аб'яднанняў, такіх як ШАС (Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва), БРІКС (названа паводле англамоўнай абрэвіятуры краін: Бразіліі, Расіі, Індыі, Кітая, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі (ПАР)), выступілі фактарамі, якія падарвалі гегемонію адной краіны.

Кітай у першай чвэрці XXI ст. з'яўляецца першай эканомікай свету паводле парытэту пакупніцкай здольнасці, а яго ініцыятывы, такія як «Адзін пояс — адзін шлях», накіраваныя на развіццё інфраструктуры



Як вы лічыце, якія яшчэ краіны прэтэндуюць на ролю рэгіянальных лідараў?

і гандлёвых сувязей паміж Азіяй, Еўропай і Афрыкай, дэманструюць гатоўнасць да глабальнага лідарства.

Расія, абапіраючыся на багатыя прыродныя рэсурсы, абаронны патэнцыял і актыўную знешнюю палітыку, настойвае на шматпалярным падыходзе да сусветнай бяспекі, удзельнічае ў рэгіянальных канфліктах, выступае за абарону міжнароднага права, суверэнітэту іншых дзяржаў і развіццё партнёрскіх адносін з імі.

Індыя, маючы самую вялікую колькасць насельніцтва, устойлівую эканоміку і стратэгічнае становішча, таксама ўзмацняе свае пазіцыі. Яна актыўна ўдзельнічае ў міжнародных форумах, развівае ўласныя тэхналогіі і ўмацоўвае супрацоўніцтва з іншымі цэнтрамі сілы.

Усё большую ролю ў рэгіянальнай і сусветнай палітыцы адыгрываюць Іран, Турцыя, Бразілія, ПАР і іншыя краіны.

Такім чынам, з пачатку XXI ст. у свеце адбываецца пераход ад аднапалярнай мадэлі да шматпалярнай. Гэты працэс не завершаны і суправаджаецца канкурэнцыяй, канфліктамі інтарэсаў і барацьбой за ўплыў. Аднак ён адлюстроўвае аб'ектыўную рэальнасць — імкненне многіх дзяржаў да стварэння больш справядлівага і збалансаванага свету ў параўнанні з эпохай панавання адной дзяржавы.

Успомніце, што такое рэвалюцыя. У чым яе адрозненне ад рэформы?

**5. «Каляровыя рэвалюцыі».** У другой палове 1990-х — пачатку 2000-х гг. у шэрагу краін адбыліся дзяржаўныя перавароты пад лозунгамі дэмакратызацыі, барацьбы супраць карупцыі, абароны правоў чалавека і з заклікамі збліжэння з Захадам. Гэтыя падзеі атрымалі назву **«каляровыя рэвалюцыі»**, хоць паўнавартаснымі рэвалюцыямі іх назваць складана. Іх рухаючымі сіламі былі не вялікія сацыяльныя групы (*класы* — паводле К. Маркса), а малыя апазіцыйныя структуры, якія імкнуліся стаць новай палітычнай элітай. Як правіла, яны атрымлівалі медыйную і фінансавую падтрымку з боку замежных дзяржаў. «Каляровымі» іх пачалі назы-

**«Каляровыя рэвалюцыі»** — гэта форма палітычнай барацьбы, накіраваная на змену ўлады ў дзяржавах пад прыкрыццём дэмакратычнай рыторыкі пры актыўным знешнім умяшанні.

ваць пасля вулічных акцый, дзе пратэст сімвалізаваў пэўны колер адзення, сцягоў і стужак.

**«Каляровыя рэвалюцыі» ў свеце**

Тэрмін «каляровая рэвалюцыя» атрымаў пашырэнне пасля падзей у Югаславіі ў 2000 г., калі ў выніку масавых пратэстаў быў зрынуты Прэзідэнт Слабадан Мілошавіч. Маладзёжны рух «Адпор!» выкарыстоўваў сімволіку белага кулака на чорным фоне, якая зрабілася пазнавальным элементам пратэстаў.

Падобны сцэнарый паўтарыўся і ў шэрагу іншых краін. Напрыклад, «рэвалюцыя руж» у Грузіі (2003 г.), «аранжавая рэвалюцыя» ва Украіне (2004 г.), «цюльпанавая» ў Кіргізіі (2005 г.), еўрамайдан ва Украіне (2014 г.). Паводле розных ацэнак, з 2000-х гг. спробы або паспяховыя «каляровыя рэвалюцыі» адбыліся больш чым у 30 краінах свету, у тым ліку ў рэгіёнах Балканаў, Закаўказзя, Цэнтральнай Азіі, Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі.

**Характар «каляровых рэвалюцый»**

«Каляровыя рэвалюцыі» насілі выразна выяўлены палітычны характар. Іх галоўнай мэтай была змена кіраўніцтва, якое, на думку арганізатараў, не адпавядала «дэмакратычным стандартам» і перашкаджала збліжэнню з Захадам. Практычна ва ўсіх выпадках да ўлады прыходзілі сілы, арыентаваныя на ліберальны празаходні знешнепалітычны курс і супрацоўніцтва з ЗША, ЕС і міжнароднымі фінансавымі структурамі.

**Уплыў знешніх сіл**

Ключавую ролю ў падрыхтоўцы і правядзенні «каляровых рэвалюцый» адыгрывалі знешнія сілы — міжнародныя арганізацыі, якія аказвалі фінансавую, арганізацыйную і інфармацыйную падтрымку. Сярод іх, напрыклад, Агенцтва міжнароднага развіцця ЗША (USAID), Фонд «Адкрытае грамадства» Дж. Сораса і інш.

**Тэхналогія пратэстаў**

У «каляровых рэвалюцыях» шырока выкарыстоўвалі тэхналогію негвалтоўных пратэстаў («жывыя ланцугі», ускладанне кветак, спевы, шэсці). Але як толькі пратэсты рабіліся масавымі, яны пераходзілі ў гвалтоўную фазу — захоп урадавых будынкаў

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Расійскі гісторык А. Б. Ананчанка ў сваёй кнізе «Што трэба ведаць пра каляровыя рэвалюцыі» прыходзіць да вываду, што «каляровыя рэвалюцыі» адрозніваюцца ад класічных тым, што грамадскі лад не зазнае змен. Прыход умоўна новай групоўкі да ўлады цягне за сабой толькі змяненне палітычнага курсу і змену знешнепалітычных арыенціраў. Пры гэтым замена палітычных эліт носіць абмежаваны характар: улада пераходзіць ад адной групы эліты, якая займала ў сістэме ўлады дамінуючае становішча, да разнашэрснай кааліцыі іншых сегментаў эліты.

*1. Чым адрозніваюцца «каляровыя рэвалюцыі» ад класічных?*

*2. Што, на думку А. Б. Ананчанкі, з'яўляецца галоўным вынікам «каляровых рэвалюцый»?*

і сутыкненні з сіламі правапарадку. На гэтай стадыі пачынаўся гвалт і прамое парушэнне Канстытуцыі. Пунктам пераходу ад мірных пратэстаў да пагромаў і беспарадкаў з'яўлялася гібель людзей (наўмысная або выпадковая ахвяра), што рабілася шокам для грамадства і на некаторы, як правіла, непрацяглы час узмацняла падтрымку пратэсту. На фоне штучна выкліканага крызісу заходнія дзяржавы пачыналі перамовы з уладай з мэтай дасягнуць ад яе саступак або адстаўкі.

У некаторых краінах (Грузія, Украіна) «каляровыя рэвалюцыі» скончыліся прыходам да ўлады празаходніх сіл. У іншых (Сірыя, Лівія, Егіпет) яны прывялі да грамадзянскіх войнаў, хаосу, разбурэння дзяржаўнасці.

**Процідзеянне «каляровым рэвалюцыям»**

Краіны, якія здолелі паспяхова супрацьстаяць падобнаму ўмяшанню ва ўнутраныя справы дзяржавы, у тым ліку Расія, Кітай, Іран і Беларусь, пачалі разглядаць «каляровыя рэвалюцыі» як форму гібрыднай вайны і рабіць адпаведныя захады для супрацьдзеяння. Пад гібрыднай вайной разумеюць спосаб вядзення канфлікту, які спалучае традыцыйныя і нетрадыцыйныя метады барацьбы — ад ваенных дзеянняў да інфармацыйных атак, эканамічнага ціску, санкцый і г. д.

*З пачатку XXI ст. у свеце адбываецца пераход ад аднапалярнай мадэлі да шматпалярнай. Гэты працэс не завершаны і суправаджаецца канкурэнцыяй, канфліктамі інтарэсаў і барацьбой за ўплыў. «Каляровыя рэвалюцыі» зрабіліся важным элементам сучаснай міжнароднай палітыкі і адлюстроўваюць імкненне адных сіл навязаць іншым сваю мадэль развіцця, часцяком у абыход нормаў міжнароднага права і суверэнітэту. У гэтых умовах асаблівую актуальнасць набываюць умацаванне нацыянальнай бяспекі дзяржавы, абарона нацыянальных інтарэсаў, культуры і суверэнітэту.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| 1 студзеня 2024 г. — далучэнне да БРІКС у якасці новых паўнапраўных членаў Егіпта, Ірана, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў (ААЭ), Эфіопіі | 11 лістапада 2024 г. — Беларусь афіцыйна зрабілася краінай — партнёрам БРІКС |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце геапалітычныя наступствы распаду СССР.
2. Прывядзіце прыклады праяў глабалізацыі ў палітыцы, эканоміцы, духоўным жыцці. Дайце сваю ацэнку гэтай з'явы.
3. Ахарактарызуйце змены, якія адбываюцца ў розных сферах грамадскага жыцця падчас пераходу да постіндустрыяльнага грамадства.
4. У чым праяўляецца станаўленне шматпалярнага свету? Якія дзяржавы з'яўляюцца ў наш час рэгіянальнымі лідарамі?
5. Назавіце прыкметы паняцця «каляровая рэвалюцыя». Чаму яны зрабіліся важным элементам міжнароднай палітыкі ў XXI ст.?